УДК 821.161.3.09-1

***А.В. ГІРЫНА***

# СУЧАСНАЯ ВІЗУАЛЬНАЯ ПАЭЗІЯ: ГРАФІЧНЫЯ ФОРМЫ АДЛЮСТРАВАННЯ ЗМЕСТУ

*У артыкуле візуальная паэзія разглядаецца як авангардны накірунак на стыку паэзіі і выяўленчага мастацтва. Выяўлена, што сучасныя візуальныя творы характарызуюцца мнагаслойнасцю, нестандартнасцю і шматграннасцю вырашэння паэтычнай думкі, а найбольш адметнай прыкметай візуальнай паэзіі з'яўляецца наяўнасць вербальных кампанентаў. Зроблены высновы аб тым, што візуальная паэзія яшчэ не афармілася як жанр або літаратурны напрамак; інфармацыйныя тэхналогіі дазваляюць выкарыстоўваць разнастайныя тэхнікі і методыкі; у сучаснай беларускай візуальнай паэзіі назіраецца пераемнасць наватарскіх падыходаў, пошук новых мастацкіх ідэй і форм.*

## Уводзіны

Нягледзячы на тое, што візуальная паэзія мае шматвекавую гісторыю, сам тэрмін у сучаснай лінгвістыцы не мае адназначнай трактоўкі, да таго ж, у навуковай літаратуры функцыянуюць дублетныя назвы таго ж самага паняцця (фігурныя вершы, вершаграфіка, відэапаэзія, медыяпаэзія і інш.), што таксама паказвае на неаднастайнасць вызначэння сутнасці візуальнай паэзіі. У навуцы яшчэ не ў поўнай меры выяўлены падыходы да адказу на пытанне аб тым, паводле якіх крытэрыяў той ці іншы твор можна аднесці да візуальнай паэзіі, не выпрацавана агульнапрынятага азначэння, няма згоды адносна візуальнай паэзіі як віду або жанру мастацтва. Найбольш трапнае вызначэнне сутнасці паэзіі, на нашу думку, належыць В.П. Рагойшу. Ён тлумачыць паэзію як "эмацыянальна-вобразную вершаваную творчасць" [1, с. 155] і прапануе карыстацца наступнымі суадносінамі паняццяў (ад агульнага да прыватнага): *род – від – жанр.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***Мэта:*** даць агульную характарыстыку некаторых тыпалагічных асаблівасцей сучаснай беларускай візуальнай паэзіі.

***Задачы:*** разгледзець падыходы сучасных аўтараў да вызначэння сутнасці візуальнай паэзіі; прааналізаваць некаторыя формы размеркавання графічных слоў на плоскасці; вызначыць спецыфічныя рысы беларускай візуальнай паэзіі.

**Асноўная частка**

Сучасныя даследчыкі візуальнай паэзіі і самі паэты даюць самыя разнастайныя азначэнні візуальнай паэзіі. Як мяркуе Ю. Гік, "пад візуальнай паэзіяй разумеюць размыты культурны феномен, які знаходзіцца ў багатым зазоры паміж літаратурай і візуальнымі мастацтвамі" [2, с. 56]. У такое азначэнне ўкладваецца і канкрэтная паэзія, і фігурная паэзія, і многае іншае.

К. Кедраў сцвярджае, што "мяжы паміж візуальнай паэзіяй і проста ілюстрацыяй да тэксту практычна няма" [3]. Нават паэты-візуалісты часта самі не адрозніваюць візуальную паэзію ад графічных ці іншых выяўленчых твораў. Толькі зыходзячы з вызначэння самога аўтара ці аўтарскага каментарыя, дзякуючы такой зададзенасці ў загалоўку або размяшчэнню ў кантэксце іншых вершаў можна сказаць, што гэта візуальная паэзія. Напрыклад, наўрад ці можна лічыць паэтычным наступны візуальны твор:



**П. Андруковіч. "Ветер"**

Сучасныя паэты і даследчыкі даюць розныя азначэнні візуальнай паэзіі. С.Я. Бірукоў лічыць, што "візуальная паэзія – паэзія пад мікраскопам. Гэта перабольшаная паэзія або перабольшанне паэзіяй уласных правоў. Паэзія хоча быць усім, але перш за ўсё яна хоча быць бачнай" [4, с. 12]. Т. Хархур піша, што "дзесьці на звілістай мяжы паміж выяўленчым мастацтвам і літаратурай, у туманных нізінах, дзе жывапіс асабліва блізка падыходзіць да паэзіі, нараджаецца новы жанр у мастацтве – візуальная паэзія" [5, с. 8]. Такім чынам, аўтары падкрэсліваюць значнасць графічных складнікаў гэтага жанру, яго візуалізацыі. С. Сігей так апісвае працэс узнікнення візуальных вершаў: "Як толькі паэты пачынаюць думаць пра тэхніку вырабу верша, пачынаецца ўласна візуальная паэзія. Інакш кажучы – паэты ператвараюцца ў мастакоў, але ствараюць пры гэтым вершы. Візуальны верш пераважна гаворыць гледачу мовай жывапісу" [6].

Аптымістычна гучаць словы Т. Назаранкі аб перспектывах візуальнай паэзіі ў XXI ст.: "Пры ўсёй неадэкватнасці і недакладнасці дадзенага тэрміна – яна нарэшце перастане быць эзатэрычнай формай крэатыву і пасля стагоддзяў мар-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гінальнага вопыту паступова пачне асвойваць перавагі магістральнага становішча ў мастацка-літаратурным працэсе. Можна выказаць здагадку, што ў найбліжэйшай будучыні візуальная паэзія атрымае поўную аўтаномію як асобны і ўнікальны від літаратурна-выяўленчай творчасці, што будзе адпаведным чынам замацавана і ў яго назве" [7].

Больш памяркоўны погляд на сучасную паэзію выказваюць беларускія даследчыкі. Так, А.І. Бельскі адзначае, што творчасць паэтычнай моладзі ў 90-я гг. асабліва красамоўна раскрывае характар пошукаў сучаснай паэзіі. На думку аўтара ў сённяшняй паэзіі ёсць свае выдаткі, пралікі. "Новай", супермадэрновай, напрыклад, аб'яўляецца версіфікацыя, дзе пануе гульня словам у імя гульні, сапраўды штучная словатворчасць. Нярэдка радок ператвараецца ў шыфроўку-рэбус, алгарытм, гучаць цьмяна-сухія абстракцыі, незразумелае філасофстваванне, дзе на ўзроўні тэксту валадарыць хаос, разбэрсанасць думкі-пачуцця [8, с. 69].

Беларускі паэт і літаратуразнавец В. Жыбуль для абазначэння твораў, якія нараджаюцца ў гэтых пошуках, прапануе карыстацца тэрмінам "візуальная паэзія". Аўтар падкрэслівае, што значную ролю ў станаўленнні беларускай візуальнай паэзіі адыгралі сувязі з літаратурамі суседніх народаў, а таксама прызнае той факт, што параўнальна з іншымі краінамі ў плане стварэння "фігурных вершаў ды іншых праяў візуальнай паэзіі, то нашы пакуль яшчэ сціплыя набыткі ў гэтай галіне" [9, с. 107].

Нягледзячы на розныя падыходы, даследчыкі візуальнай паэзіі не супярэчаць адзін аднаму ў тым, што візуальная паэзія – авангардны накірунак на стыку паэзіі і выяўленчага мастацтва, які аб'ядноўвае слова і зрокавы вобраз; візуалізацыя тэксту графічнымі элементамі пашырае яго вобразнае і сэнсавае значэнне. На нашу думку, найбольш важнай прыкметай візуальнай паэзіі з'яўляецца наяўнасць такіх вербальных кампанентаў, як літары, склады і словы.

Для разумення візуальнай паэзіі важна заўвага К.А. Слуцкай аб тым, што на працягу яшчэ нясконачанай эвалюцыі гэтага жанру адно заставалася нязменным: візуальная паэзія заўсёды прадугледжвала гульнявы кампанент у выглядзе запрашэння да сааўтарства, нетрадыцыйнага размяшчэння вербальнага элемента або шрыфтавога вар'іравання ці моўнай гульні [10, с. 53].

Найбольш выразнымі з'явамі, якія ілюструюць візуальную паэзію, з'яўляюцца такія формы, як акраверш, тэлеверш, мезаверш, лабірынт, паліндром і іншыя, яшчэ больш ускладненыя формы размеркавання графічных слоў на плоскасці. М. Багдановіч напісаў надзвычай арыгінальны, першы ва ўсходнеславянскай паэзіі "Четверной акростих", што аб'ядноўвае прыметы акраверша, тэлеверша і мезаверша:

**А**х, как умеете Вы, **Анна**,
**Н**е замечать, что я влюбле**н**.
**Н**о все же шлю я Вам не сто**н**,
**А** возглас радостный: ос**анна**!
М. Багдановіч. "Четверной акростих"

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Яскравым прыкладам лабірынта можа быць верш Т. Манковай “Ариадна”:




**Т. Манкова. “Ариадна”**

Адной з разнавіднасцяў паэтычнай графікі з’яўляюцца паліндромы. Галоўнай асаблівасцю ўжывання паліндрома ў візуальнай паэзіі з’яўляецца яго спалучальнасць з графікай, у выніку чаго яркі і складаны стылістычны прыём павялічвае сваю экспрэсіўнасць і нарошчвае сэнс за кошт незвычайнага графічнага рашэння. На думку А. Бубнава, “паэзія падобна матэматыцы і нават электроніцы. Двайчная сістэма: ёсць ток і няма току. Гэтак жа і паэтычныя атамы. Асабліва наглядна гэта відаць на прыкладзе паліндромаў. Ва ўсім свеце гэта гульня. Але асабіста я лічу гэта вышэйшай паэзіяй, бо тут кожная літара на сваім месцы” [11]. Яскравым прыкладам творчасці А. Бубнава з’яўляецца твор “Посвящение Гийому (визуопалиндромный перевод каллиграмм)”:

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




А. Бубнаў. "Посвящение Гийому (визуопалиндромный перевод каллиграмм)"

Як прыклад моўнай гульні можна разгледзець амбіграмы, што ўяўляюць каліграфічны ўзор, які дазваляе сумясціць два розныя прачытанні з аднаго і таго ж набору ліній (пры павароце, адлюстраванні, пільным узіранні і г. д.). Напрыклад, амбіграма магілёўскага паэта Д. Дзмітрыева:



Д. Дзмітрыеў. "МАГУТНЫ БОЖА, ЎЛАДАР СУСВЕТУ"

В. Жыбуль так адзываецца аб творчасці Д. Дзмітрыева: "Калі, маючы на ўвазе традыцыйную паэзію, кажуць, што зь песьні слова ня выкінеш, дык зь вершаў Дзьмітрыя Дзьмітрыева і блізкіх яму аўтараў цяжка выкінуць ня тое што слова, але гук і літару. А калі казаць пра амбіграму, то тут ня выкінеш – ужо ў межах самой літары – нават маленькі кручок, выгін ці завітушку. У гэтым сэнсе працэс стварэньня амбіграмы нагадвае працу хірурга альбо фізыка-атамшчыка. Творца, які займаецца амбіграмамі рэгулярна, звычайна выпрацоўвае свой адметны, уласьцівы толькі яму, стыль-почырк" [12].

Да нетрадыцыйнага размяшчэння вербальнага элемента адносяць, у першую чаргу, фігурныя вершы, якія атрымалі шырокае распаўсюджванне ў сучаснай паэзіі (іншыя назвы: графічныя вершы, вершаграфіка, каліграма), у якіх графічны малюнак радкоў або выдзеленых у радках літар складаецца ў малюнак якой-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

небудзь фігуры або прадмета, а цэнтральны вобраз звычайна апрадмечваецца формай, дзякуючы чаму ўзрастае значнасць і выразнасць тэксту.

У творчасці сучасных беларускіх паэтаў фігурныя вершы набываюць самую розную форму: напрыклад, верш “Спаленая вёска” Ю. Пацюпы мае форму трохкутніка, “Трансфіліпуцыя” В. Жыбуля – ромба, “пад’езныя норы...” С. Мінскевіча – квадрата, “Трохвугольныя нерэальнасці” А. Кавалеўскага – трапецыі і інш. Верш А. Глобуса “Жах” мае форму крыжа:

жах
жах
жах
увесь сьвет у крыжах, увесь сьвет
жах
жах
увесь сьвет у крыжах, увесь сьвет
жах
жах
жах
жах

**А. Глобус. “Жах”**

Сучасная візуальная паэзія вызначаецца наступнымі характэрнымі рысамі: візуальны верш можа складацца нават з аднаго слова ці словазлучэння, аднаго або некалькіх сказаў, некалькіх марфем або службовых слоў, гука-літарных спалучэнняў; магчыма ўкараненне ў тэкст геаметрычных фігур, матэматычных элементаў, сінтэз вербальных і нотных знакаў і г. д.; гульні са святлом і ценем, разнастайныя невербальныя і вербальныя тэхнікі і прыёмы. Дзякуючы мультымедыйнаму інструментарыю паэты-візуалісты маюць вялікі выбар шрыфтоў, выкарыстоўваюць розныя фонавыя і каляровыя рашэнні, эфекты руху і з’яўлення, альтэрнатыўныя фонавыя і каляровыя рашэнні, эфект тэкстуры, маляванне і анімацыя, метамарфозы шрыфтоў, знакаў (ад моўных да графічных) і як вынік – трансфармацыі сэнсу на розных узроўнях візуальнага паэтычнага тэксту і многае іншае [13, с. 44–46]. Такім чынам, стварэнне візуальнай паэзіі з дапамогай сучасных камп’ютарных сродкаў з’яўляецца той нішай, якая яшчэ толькі пачала запаўняцца і на сённяшні дзень робяцца толькі першыя спробы ў гэтай творчай вобласці.

## Заключэнне

Нягледзячы на сваё актыўнае распаўсюджанне ў сучасным мастацтве, візуальная паэзія, узнікшы з сінтэзу графікі і паэзіі, носіць дастаткова традыцыйны характар, застаючыся на працягу доўгага часу вельмі актуальнай з’явай як у паэзіі, так і ў літаратурнай крытыцы. Увагу даследчыкаў у візуальнай паэзіі прыцягвае нестандартнасць вырашэння паэтычнай думкі, шматпланавая вобразнасць тэксту за кошт трохмернага малюнка, які выводзіць на новы ўзровень успрыняцця аўтарскай ідэі, прызывае чытача да сааўтарства. Візуальная паэзія знаходзіцца на стыку паэзіі і жывапісу, графікі, пластыкі, фатаграфіі; у сучаснай візуальнай паэзіі назіраецца жанрава-стылёвая разнастайнасць, свабода зместу і формы; візуальная паэзія яшчэ да канца не аформілася як жанр або літаратурны напрамак.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Візуальная паэзія патрабуе пільнай увагі чытача, таму што ў сучасным паэтычным дыскурсе лінейная арганізацыя вершаванага тэксту перастае быць абавязковай, тэкст можа размяшчацца па вертыкалі, дыяганалі, набываць выгляд любой геаметрычнай фігуры або рэчы. У візуальным тэксце сэнсавая і мастацкая нагрузкі размяркоўваюцца паміж паэтычным паведамленнем і выяўленчай формай яго адлюстравання, прычым створаны комплексны змест не можа быць выражаны ўзятымі паасобку выкарыстанымі ў творы мастацкімі сродкамі, што сведчыць аб інтэртэкстуальнасці візуальнай паэзіі.

Імклівае развіццё інфармацыйных тэхналогій адкрывае новыя шляхі для візуальнай паэзіі, а сучасныя сродкі масавай камунікацыі спрыяюць даступнасці і шпаркасці распаўсюджвання новых мастацкіх ідэй, прыёмаў і тэхналогій сярод сусветнай творчай супольнасці, уключэнню эксперыментатараў розных краін у арбіту агульнасусветнага мастацкага пошуку. Большасць сучасных візуальных твораў характарызуюцца мнагаслойнасцю, сінтэзам тэксту і візуальных сродкаў з выкарыстаннем самых разнастайных тэхнік і методык.

Беларуская візуальная творчасць не так шырока прадстаўлена, як руская і сусветная. Для некаторых сучасных беларускіх паэтаў вынаходніцтва зусім новых (напрыклад, версэты, вершаказы, квантэмы, зномы А. Разанава) і ўвядзенне ў беларускую славеснасць вядомых у сусветнай паэзіі вершаваных формаў (В. Жыбуль, напрыклад, упершыню ў беларускай паэзіі стварыў паліндрамічную паэму "Рогі гор") з'яўляецца справай першаступеннай важнасці. Аналіз найбольш адметных прыкладаў візуальных твораў як беларускіх, так і замежных аўтараў сведчыць аб існаванні пэўных традыцый, пераемнасці наватарскіх падыходаў. Па сутнасці, беларуская літаратура карыстаецца ўсімі відамі і жанрамі, якія актуалізаваны як рускай, так і сусветнай літаратурай. Гэта заўвага ў поўнай меры адносіцца і да візуальнай паэзіі.

## *СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ*


1. ***Рагойша, В.П.*** Уводзіны ў літаратуразнаўства : вучэб. дапам. – Ч. 1 : Літаратуразнаўства як навука. Эстэтыка літаратуры. Паэтыка / В.П. Рагойша, М.П. Кенька, Т.А. Марозава ; пад рэд. В.П. Рагойшы. – Мінск : БДУ, 2011. – 247 с.
2. ***Гик, Ю.*** Наследие Дада в современной визуальной поэзии / Ю. Гик // Выставка визуальной поэзии [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://platform.netslova.ru/texty/gik_dada.html. – Дата доступа : 01.12.2013.
3. ***Кедров, К.*** Стихи. / К. Кедров // Интервью [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.stihi.ru/2009/07/15/3952. – Дата доступа : 01.12.2013.
4. ***Бирюков, С.*** Визуальная поэзия в России / С. Бирюков // Черновик [Электронный ресурс]. – 1997. – № 12. – Режим доступа : http://www.vavilon.ru/metatext/chernovik12/visual.html. – Дата доступа : 01.12.2013.
5. ***Товий, Х.*** Слияние поэзии и живописи / Х. Товий // ЛИМБ [Электронный ресурс]. – 2002. – № 12. – Режим доступа : http://limb.dat.ru/No12/essay/harhur2.shtml. – Дата доступа : 01.12.2013.
6. ***Сигей, С.*** О природе визуальной поэзии. Интервью с Михаилом Рыклиным / С. Сигей // Черновик [Электронный ресурс]. – 1990. – № 3. – Режим доступа : litfest.ru›news/vizualnaja_poehzija/2011-06-02. – Дата доступа : 01.12.2013. Сигей, С. О природе визуальной поэзии. Интервью с Михаилом Рыклиным // Черновик: альманах. – 1990. – № 3. – С. 22–32.
7. ***Назаренко, Т.*** Визуальная поэзия / Т. Назаренко // Черновик [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.chernovik.org/vizual/?rub_id=5&leng=ru. – Дата доступа : 01.12.2013.
8. ***Бельскі, А.І.*** Сучасная беларуская літаратура : вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў / А.І. Бельскі. – Мінск : Народная асвета, 1997. – 223 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

9. ***Жыбуль, В.*** Кароткая гісторыя беларускай візуальнай паэзіі / В. Жыбуль // Тэксты. – 2007. – № 3. – С. 107–129.
10. ***Слуцкая, К.А.*** Языковая игра как средство реализации поэтической функции визуальной поэзии / К.А. Слуцкая // Вестник Челябинского государственного университета. Филология. Искусствоведение. – Вып. 72. –2012. – № 36(290). – С. 53–57.
11. ***Бубнов, А.*** Смотри на меня без очков / А. Бубнов // Параллель [Электронный ресурс]. – № 36. – Режим доступа : http://www.45parallel.net/aleksandr_bubnov/. – Дата доступа : 01.12.2013.
12. ***Жыбуль, В.*** Мікрахірургія слова, альбо Пачатак беларускай амбіграматыкі / Ж. Віктар // A R C H E [Электронный ресурс]. – 2007. – № 11. – Режим доступа : http://arche.bymedia.net/2007-11/dzmitryjeu711.htm. – Дата доступа : 01.12.2013.
13. ***Минаева, Э.*** Современный поэтический дискурс : коды визуальной поэзии современный дискурс-анализ / Э. Минаева, Т. Пономарева / Современный дискурс-анализ [Электронный ресурс]. – 2013. – № 9. – Режим доступа : http://discourseanalysis.org/ada9/st66.shtml. – Дата доступа : 01.12.2013.

Поступила в редакцию 20.02.2014 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова